Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
___________М.А.Бяспалая
__”__________2019 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
___________Ю.М. Галкоўская
__”__________2019 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
**АРХЕАЛОГІЯ**
для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа
і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)

Складальнік:
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства, кандыдат
гістарычных навук, дацэнт А.А. Трусаў

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта “16” красавіка 2019 г.
пратакол №8

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнік:

*Трусаў А.А., дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*

Рэцэнзенты:

*А.У.Вайцэховіч,* загадчык аддзела захавання і карыстання археалагічнай спадчыны Дзяржаўная навуковая установа "Інстытут Гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", кандыдат гістарычных навук;
*А.М. Кушнярэвіч,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", , доктар мастацтвазнаўства.

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*Кафедрой гісторыі Беларусі і музеязнаўства*

*(пратакол ад 2019 г. №);*

*Саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый*

*(пратакол ад 2019 г. №);*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Змест**

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4

2. ТЭАРЫТЫЧНЫ РАДЗЕЛ 7

2.1 План-канспект лекцый 7

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 16

3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 16

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 20

4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў 20

4.2 Пытанні да самаправеркі 20

4.3 Пытанні да экзамена 21

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 23

5.1 Тэматычны план 23

5.2 Асноўная літаратура 25

5.3 Дадатковая літаратура 26

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Археалогія» - агульнаадукацыйная дысцыплина, выкладанне якой вядзецца ў паглыбленным аб’ёме ў форме лекцый, семінарскіх заняткаў і самастойнай работы. У гэтым курсе паслядоўна разглядаюцца эканамічныя і культурныя працэсы, якія спрыялі паступоваму тэхналагічнаму прагрэсу чалавецтва на ранніх этапах яго гістарычнага развіцця.

Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны. “Археалогія” дае асновы археалагічных ведаў аб развіцці археалагічнай навукі ў Еўропе і за яе межамі, яе асноўных дасягненнях на тэрыторыі Беларусі ад з’яўлення тут першых людзей да канца XVIII ст.

Асноўная ўвага надаецца гісторыі археалагічнай навукі ў Беларусі, яе найбольш вядомым прадстаўнікам, якія працавалі тут у XVIII-XX стст., а таксама даецца падрабязная характарыстыка тых археалагічных культур, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі ў эпоху палеаліту, мезаліту, неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў.

Пачынаючы з I тыс. н. э. археалагічныя культуры паступова пачынаюць набываць канкрэтнае этнічнае аблічча. Вучэбная праграма разглядае праблему паходжання славян, іх рассяленне на тэрыторыі Беларусі, кантакты з мясцовым балцкім насельніцтвам, а таксама з варагамі і германцамі.

У вучэбна-метадычным комплексе таксама разглядаецца перыяд ранняга і позняга феадалізму, на які прыпадае час узнікнення першых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі (Полацкая, Турава-Пінская, Смаленская і Навагрудская землі і Гродзенскае княства). Асаблівая ўвага надаецца матэрыяльнай культуры першых беларускіх гарадоў (Полацк, Менск, Віцебск, Бярэсце, Гародня, Наваградак, Пінск, Мсціслаў і інш.).

Шмат увагі надаецца і беларускай археалогіі новага часу, якая вывучае матэрыяльную культуру часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, у тым ліку архітэктурнай археалогіі.

*Асноўныя мэты вывучэння вучэбнай дысцыпліны* – засваенне студэнтамі асноў археалогіі неабходных для спецыяліста ў галіне музейнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Важнейшымі *задачамі* дысцыпліны з’яўляюцца:

- даць студэнтам уяўленне аб прыродзе археалогіі і яе месцы ў сістэме навук;
- асэнсаванне ролі археалагічных крыніц для вывучэння гістарычнага мінулага насельніцтва;
- раскрыццё сутнасці і паслядоўнасці гістарычнага развіцця беларускай матэрыяльнай культуры ад яе вытокаў да канца позняга сярэднявечча метадамі археалогіі.

Студэнты павінны *ўмець:*

- вызначаць ролю археалогіі ў агульным гістарычным працэсе развіцця сусветнай цывілізацыі;
- дакладна аналізаваць гістарычныя падзеі і факты і іх уплыў на тэхнічны працэс, параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, адлюстраваныя ў гістарычных крыніцах;
- крытычна аналізаваць крыніцы на розных мовах і аргументаваць уласны пункт гледжання;
- вылучаць асноўныя дасягненні ў галіне гісторыі культуры каменнага, бронзавага і жалезнага векоў, эпохі сярэднявечча і новага часу на тэрыторыі Беларусі.

Студэнты павінны *авалодаць:*

- асноўнымі і дадатковымі крыніцамі ў іх узаемасувязі і разнастайнасці для атрымання поўнай інфармацыі па вывучаемых праблемах, асабліва пры падрыхтоўцы да семінарскіх і самастойных заняткаў;
- інфармацыяй з інтэрнета, а таксама розных навучальных фільмаў і іншага ілюстрацыйнага матэрыялу.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

–метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Археалогія” прадугледжана 168 гадзін, з іх 66 – аўдыторных (54 – лекцыйных, 12 – семінарскіх). Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

*Тэма 1. Уводзіны*

Прадмет, мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны "Археалогія". Змест асноўных раздзелаў тэматычнага плана. Сувязь вучэбнай дысцыпліны з сацыяльна-гуманітарнымі і спецыяльнымі дысцыплінамі. Формы вучэбных заняткаў і кантролю. Крыніцы і методыка вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Археалогія"..

### Р а з д з е л І. Станаўленне і развіццё археалагічнай навукі

*Тэма 2. Асноўныя метады археалагічных даследаванняў*

Вызначэнне тэрміна "археалагічная культура" і яе асноўныя кампаненты. Генезіс. Этнас. Субстрат. Асіміляцыя. Этнонім. Археалагічнае датаванне. Археалагічныя метады: параўнальна-тыпалагічны, археамагнітны, радыякарбонны, дендрахраналогія. Тып і тыпаліст. Трасалогія.

Археалагічны комплекс (адкрыты і закрыты). Палявая археалогія. Археалагічныя раскопкі. "Адкрыты ліст" і яго формы. Палявы дзённік. Палявы вопіс. Індывідуальныя і масавыя знаходкі. Камеральная апрацоўка. Археалагічная справаздача.

Падводная археалогія. Архітэктурная археалогія.

*Тэма 3. Развіццё археалогіі як навукі*

Першыя археалагічныя раскопкі ў старажытным свеце. Вызначэнне тэрміна "археалогія" грэчаскім філосафам Платонам. Вучэнне Лукрэцыя Кара.

Еўрапейскае скарбашукальніцтва часоў сярэднявечча. Раскопкі 1420 г. у Пскове. Руская археалогія XVIII ст. (Кунсткамера Пятра І, Інструкцыя В.М.Тацішчава). Раскопкі Пампей. Адкрыццё старажытнай Трої (раскопкі Г. Шлімана). Руская археалогія XIX – пачатку XX стст. Раскопкі А.Эванса на Крыце. Адкрыццё грабніцы Тутанхамона. Станаўленне і развіццё савецкай археалогіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Еўрапейская археалогія другой паловы XX ст.

*Тэма 4. Беларуская археалогія XVIII – пачатку XX ст.*

Беларуская археалогія XVIII ст. (Калекцыі беларускіх магнатаў, раскопкі ў маёнтку “Мосар” і Бельчыцкага манастыра). Адкрыццё Двінскіх камянёў з надпісамі.

З.Даленга-Хадакоўскі. Т.Нарбут. Браты К. і Я.Тышкевічы. Археалагічная калекцыя музея ў Лагойску. Віленскі музей старажытнасцей. А. Г. Кіркор. IX археалагічны з’езд у Вільні. Е.Р. Раманаў. Царкоўная археалогія. Рэстаўрацыйныя працы П.П.Пакрышкіна на Беларусі. IX Археалагічны з’езд у Вільні.

Археалагічныя калекцыі Беларускага музея імя Івана Луцэвіча ў Вільні. Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. І. Луцкевіч.

*Тэма 5. Беларуская археалогія ў 1919-1941 гг.*

Археалогія ў БССР (1919-1941 гг.). Інстытут беларускай культуры і яго гісторыка-археалагічная секцыя. Дзейнасць гісторыка-археалагічнай камісіі.
М.В. Доўнар-Запольскі. Першы з’езд даследчыкаў беларускай археалогіі і яго вынікі (Мінск, 1926 г.). Стварэнне Акадэміі Навук БССР. Першыя савецкія беларускія археолагі і іх дзейнасць. А.М. Ляўданскі. К.М. Палікарповіч. С.А.Дубінскі. І.М. Хозераў. Інстытут гісторыі АН БССР. Часопіс “Наш край”і археалагічная тэматыка на яго старонках.

Сталінскія рэпрэсіі 1930-х гг., разгром беларускай археалагічнай навукі.

Археалогія на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.). Беларускі мастак і археолаг Язэп Драздовіч. Уладзімір і Гелена Галубовічы.

Раскопкі старажытнай Гародні. Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. Язэп Ядкоўскі і Здзіслаў Дурчэўскі. Кансервацыйныя працы ў Навагрудку, Гродне, Лідскім і Крэўскім замках. Раскопкі ў Давыд-Гарадку.

*Тэма 6. Беларуская археалогія другой паловы XX – пачатку XXI стст.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аддзел археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР. Вывучэнне культур каменнага і бронзавага вякоў на тэрыторыі Беларусі. У.Ф. Ісаенка, У.Д. Будзько, У.П. Ксянзоў, А.Г. Калечыц, М.М. Чарняўскі.

Даследаванні помнікаў жалезнага веку. А.Р. Мітрафанаў, Л.Д. Побаль, М.Ф. Гурын, В.І. Шадыра. Працы маскоўскіх і ленінградскіх археолагаў на беларускай тэрыторыі. В.М. Мельнікоўская, П.М. Траццякоў, Ю.В. Кухарэнка, В.В. Сядоў. Раскопкі старажытных беларускіх гарадоў і курганных могільнікаў. Г.В. Штыхаў, Л.В. Аляксеяў, Ф.Д. Гурэвіч, П.Ф. Лысенка, Э.М. Загарульскі. Стварэнне кафедры археалогіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Даследаванні старажытных помнікаў беларускага дойлідства. М.М. Варонін, П.А. Рапапорт, М.К. Каргер, М.А. Ткачоў, М.У. Малеўская. Дзейнасць Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і яго выданні. Сучасны стан беларускай археалагічнай навукі.

## Раздзел ІІ. Археалогія першабытнага грамадства

### *Тэма 7. Каменны век на тэрыторыі Беларусі*

Пачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі ў эпоху сярэдняга палеаліту. Тагачасны клімат. Зледзяненні (дняпроўскае, сожскае, валдайскае). Першыя прылады працы.

Верхні палеаліт. Першыя стаянкі. Бердыж (Чачэрскі раён). Юравічы (Калінкавіцскі раён). Палеалітычнае мастацтва. Грэнская і свідэрская культуры эпохі фінальнага палеаліту.

Мезаліт. Новыя кліматычныя ўмовы. Мікраліты і макраліты. Стаянкі часоў мезаліта. Свідэрская мезалітычная культура. Сожская, днепра-двінская, бутаўская культура. Матрыярхат.

Неалітычная рэвалюцыя. Шліхтаваныя каменныя прылады працы. Першы гліняны посуд. Асновы земляробства і жывёлагадоўлі. Неалітычныя крамнёвыя шахты. Днепраданецкая культура. Нарвенская культура. Апрацоўка бурштыну.

Нёманская культура. Скульптурныя выявы (стаянкі Асавец, Добры бор, Камень). Культура лейкападобных кубкаў. Асноўныя тыпы неалітычнага арнаменту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 8. Бронзавы і жалезны век на тэрыторыі Беларусі*

Росквіт каменнай індустрыі на тэрыторыі Беларусі. Новыя спосабы апрацоўкі крэмяню. Мастацтва эпохі бронзы. Першыя шкляныя пацеркі і бісер. Вырабы з бурштыну. Арнаментыка керамікі і яе асноўныя формы. Апрацоўка бронзы. Сякеры-кельты. Археалагічныя культуры бронзавага веку. (Сярэднедняпроўская, паўночна-беларуская, культура шарападобных амфар, тшыцінецкая, сосніцкая). Плямёны шнураванай керамікі. З'яўленне старажытных індаеўрапейцаў.

Умацаванне патрыярхальна-радавога ладу, рост прадукцыйных сіл, развіццё жывёлагадоўлі і земляробства, з'яўленне ўстойлівых этнічных аб'яднанняў. Мілаградская, паморская і зарубінецкая культуры. Днепра-дзвінская культура. Культура штрыхованай керамікі. Балтцкія плямёны, гарадзішча Банцараўшчына. Готы і гепіды на тэрыторыі Беларусі. Вельбарская культура. Палі пахавальных урнаў. Падклёшавыя пахаванні і кенатафы. Печы-домніцы. Першыя славяне на Беларусі. Пражская культура.

## Раздзел III. Археалогія ранняга сярэднявечча

*Тэма 9. Насельніцтва Беларусі ў VI-IX стст.*

Арэал рассялення балтаў у Еўропе. Заходнія, усходнія і дняпроўскія балты. Асноўныя рысы матэрыяльнай культуры балцскіх плямён. Балцкія гарадзішчы. Усходнелітоўскія курганы і пахавальны абрад. Асноўныя этнічныя прыкметы балтаў (адзенне, абутак, упрыгожванні, кераміка, зброя). Яцвягі на Беларусі, асноўны арэал рассялення. Каменныя курганы.

Рассяленне славян па Дзясне і Дняпры. Племянные групы крывічоў і іх асноўная тэрыторыя рассялення. Полацкія крывічы (палачане). Смаленскія крывічы. Пскоўскія крывічы. Этнонім тэрміна "крывічы" і яго паходжанне. Пісьмовыя крыніцы аб крывічах. Культуры доўгіх курганоў паўночнай Беларусі. Пскоўскія і смаленскія доўгія курганы. Круглыя курганы X-XI стст. Характэрныя этнічныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкметы полацкіх і смаленскіх крывічоў. Скроневыя колцы. Пераход да хрысціянскага пахавальнага абраду. Тры хвалі славянскай каланізацыі.

Асноўны арэал рассялення дрыгавічоў. Племянныя адзнакі дрыгавічоў. Першыя гарады на дрыгавіцкай тэрыторыі. Славянскія селішчы Панямоння.

Этнічная тэрыторыя радзімічаў, іх племянныя адзнакі. Валыняне на Беларусі, іх матэрыяльная культура.

Паходы кіеўскіх князёў на яцвягаў. Разгром яцвягаў у XIII ст. Прусы і крыжацкая навала. Перасяленне прусаў на тэрыторыю Беларусі. Шлях з "варагаў у грэкі" і яго асноўныя разгалінаванні. Скандынаўскія знаходкі на Беларусі. Руны. Гарадзішча Маскавічы. Асноўныя этапы кантактаў варагаў і славян (VIII-X стст.)

*Тэма 10. Полацкая зямля па дадзеных археалогіі*

Полацкая, Мінская, Друцкая, Віцебская валасці-удзелы. Ізяслаўска-лагожскі і Лукомльскі ўдзелы. Асноўныя водныя шляхі. Межавыя знакі. Гандаль. Гаспадарка Полацкай зямлі. Асноўныя гаспадарчыя заняткі. Полацкая кераміка, апрацоўка металу, каменю і косці. Ювелірная справа. Узнікненне хрысціянства. Барысавы і Рагвалодаў камяні. Манументальнае і прыкладное мастацтва.

*Тэма 11. Смаленская зямля. Старажытны Мсціслаў*

Тэрыторыя Смаленскай зямлі і прыродныя ўмовы. Гнёздаўскі археалагічны комплекс. Водныя шляхі. Гандлёвыя сувязі.

Структура ўдзелаў смаленскай зямлі, далучэнне тэрыторый вяцічаў і радзімічаў паводле археалагічных дадзеных. Суадносіны паміж уладай князя і вечам. Росквіт Смаленскай зямлі ў XII-XIII стст. Археалагічнае вывучэнне гарадоў беларускай Смаленшчыны (Орша, Копысь, Крычаў, Слаўгарад). Матэрыяльная культура старадаўняга Мсціслава. Берасцяныя граматы. Уплыў полацкай архітэктуры на смаленскае дойлідства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 12. Тураўская зямля. Старажытны Пінск*

Тэрыторыя і кліматычныя ўмовы. Карысныя выкапні. Узнікненне старадаўняга Турава. Тураўскі храм. Матэрыяльная культура Пінска. Узнікненне Турава-Пінскага княства. Стасункі паміж кіеўскімі і тураўскімі князямі. Раскопкі старажытных Слуцка і Рагачова.

Гарады паўднёвай Беларусі. Матэрыяльная культура Мазыра і Гомеля. Тураўскі краязнаўчы музей. Археалагічны музей “Бярэсце”.

*Тэма 13. Гродзенскае княства. Старажытны Навагрудак*

Узнікненне славянскіх гарадоў у басейне Немана. Летапісная Гародня. Матэрыяльная культура Гродна ў XI-XIII стст. Археалагічныя раскопкі Старога замка. Гродзенскі пасад. Каложскі манастыр.

Старадаўні Ваўкавыск. Ваўкавыскі храм. Матэрыяльная культура Слоніма XI-XIII стст. Узнікненне Навагрудка. Дзяцінец і вакольны горад.

Гандлёвыя сувязі старадаўняга Навагрудка. Барысаглебская царква. Узнікненне наваградскай зямлі ў XIII ст. Навагрудак – першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага.

*Тэма 14. Архітэктурная археалогія*

Першыя раскопкі помнікаў мураванага дойлідства Беларусі ў XVIII – пачатку XX ст. Спробы рэстаўрацыі і навуковага вывучэння ацалелых помнкаў архітэктуры XIX – пачатку XX стст. Дзейнасць П.П. Пакрышкіна і В.У. Суслава.

І.М.Хозераў – даследчык полацкага і смаленскага дойлідства XI-XIII стст. Полацкая і Віцебская архітэктурныя школы. М.М.Шчакаціхін і яго дзейнасць. Археалагічныя раскопкі помнікаў гродзенскай архітэктуры. Гродзенская архітэктурная школа. Вывучэнне помнікаў архітэктуры ў другой палове XX ст. Методыка архітэктурна-археалагічных даследаванняў. Старажытныя будаўнічыя матэрыялы. Тэхніка муроўкі. Структура будаўнічай арцелі.

Вежы-данжоны на Беларусі. Камянецкая вежа. Замкі-кастэлі. Археалагічныя даследаванні Лідскага і Крэўскага замкаў. Вендская (балтыйская) і гатычная муроўка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Планіроўка і забудова Старога Замка ў Гродне. Археалагічнае даследаванне Мірскага замка. Бастыённыя замкі XVI – XVII стст. Раскопкі ў Заслаўскім і Гальшанскім замках.

*Тэма 15. Археалагічныя старажытнасці гарадоў Беларусі X – XIII стст.*

Узнікненне і развіццё асноўных гарадоў Беларусі. Летапісны Полацеск. Першае полацкае гарадзішча. Полацкі верхні Замак. Пабудова Полацкай Сафіі. Полацкія манастыры. Вакольны горад (ніжні замак). Запалоцце (Стары горад). Полацкае веча. Археалагічны комплекс на р. Менка. Мінскае замчышча. Мінскі храм. Старадаўні Віцебск. Віцебскія замкі. Архітэктура Віцебска XII ст. Раскопкі старажытнага Друцка і Браслава. Заслаўскі археалагічны комплекс. Матэрыяльная культура Лукомля і Лагойска. Археалагічнае вызначэнне гарадоў Падняпроў'я, Пасожжа і Панямоння. З'яўленне паліванай керамікі. Шкларобчыя майстэрні XII-XIII стст. Асноўныя тыпы шкляных бранзалетаў. Шкляныя пацеркі. Першы шкляны посуд. Ваконнае шкло.

## Р а з д з е л IV. Археалогія позняга сярэднявечча і Новага часу

*Тэма 16. Археалагічныя старажытнасці Беларусі часоў ВКЛ*
*(канец XIII – першая палова XVI ст .)*

Культурны слой беларускіх гарадоў XIII-XV стст. і яго асноўныя кампаненты (бытавая кераміка, вырабы з дрэва, металу, скуры і косці). Касцярэзныя майстэрні. З'яўленне новых відаў зброі. Арбалетныя стрэлы і арбалеты. Першыя гарматы на Беларусі. Драўляная забудова. Новыя будаўнічыя матэрыялы (вялікапамерная цэгла, дахоўка). Пахавальны абрад. Адзенне, абутак, ювелірная справа. З'яўленне мястэчак. Гандлёвыя сувязі.

*Тэма 17. Археалагічныя старажытнасці Беларусі часоў Рэчы Паспалітай*
*(другая палова XVI – канец XVIII ст.)*

Асноўныя кампаненты культурнага слоя беларускіх гарадоў і мястэчак XVI-XVIII стст. З'яўленне дымлёнай і лашчонай керамікі. Беларускія і імпартныя люлькі. Новыя тыпы абутку з абцасам (трохшыпныя падкоўкі). Будаўнічыя матэрыялы (цэгла-пальчатка, паліваная дахоўка, пліткі падлогі). Новыя тыпы замкоў і ключоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кулі і кулялейкі. Каменныя і чугунныя гарматныя ядры. Паліваныя скарбонкі, дзіцячыя цацкі, свяцільнікі, рыбалоўныя грузілы. Памадныя слойкі XVIII ст.

*Тэма 18. Археалогія Беларусі Новага часу (XVI-XVIII ст.)*

Розніца ў матэрыяльнай культуры паміж дзяржаўнымі і прыватнаўласніцкімі замкамі. Гандлёвыя сувязі. Рэйнскі каменны посуд. Замкі-палацы. Смалянскі замак (Белы Ковель).

Паходжанне і этымалогія слоў кафля і "изразец". Гаршковая кафля на Беларусі ў XIV-XVII стст. Кратавая і міскавая кафля. З'яўленне каробкавай кафлі. Эвалюцыя кафляных печаў. Асноўныя тыпы каробкавай кафлі ў пячным наборы. Арнаментыка беларускай кафлі. Геральдычная і "партрэтная" кафля. З'яўленне паліванай і паліхромнай кафлі. Сюжэтная кафля. Раслінны арнамент пабудаваны на прынцыпах чатырохчленнай сіметрыі. Формы для вырабу кафлі. Ганчарныя горны. "Дывановая" кафля. Распісная "галандская" кафля XVIII ст. Адраджэнне вытворчасці паліванай керамікі на Беларусі ў XVI ст.

Сталовы паліваны посуд XVI-XVII стст. Адраджэнне беларускага шклaробства XVI ст. Гутняе шкло. Асноўныя тыпы шклянога посуду. Тарнае шкляное начынне. Вітражы. Распісныя шкляныя начынні. Беларускія шкляныя мануфактуры XVIII ст. Шкляны імпарт на Беларусі. Венецыянскае і багемскае шкло.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка семінарскіх і практычных заняткаў

Семінарскія і практычныя заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да стварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме.

### Семінар 1 Беларуская археалогія XVIII-XXст.ст.

1. З. Даленга-Хадакоўскі – заснавальнік беларускай археалогіі.
2. Браты Канстанцін і Яўфстафій Тышкевічы і іх дзейнасць.
3. Археалагічная калекцыя музея ў Лагойску. Віленскі музей старажытнасцей.
4. IX археалагічны з’езд у Вільні.
5. Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута.

Літаратура:


1. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Белоруссии XVI в. – 30-е годы XX в. / под ред. Б.А. Рыбакова. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
2. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX стст./ Г.А.Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.


### Семінар 2 Беларуская археалогія ў 1919-1941 гг.

1. Інстытут беларускай культуры і яго гісторыка-археалагічная секцыя.
2. Першы з’езд дакладчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі і яго вынікі.
3. Першыя беларускія археолагі і іх дзейнасць.
4. Беларускі музей у Вільне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Раскопкі старажытнай Гародні.

Літаратура:

1. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Белоруссии XVI в. – 30-е годы XX в. / под ред. Б.А. Рыбакова. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
2. Вяргей, В.С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР. 1919-1941 гг./ В.С.Вяргей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.
3. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества XI-XVII вв. / О.А.Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 160 с.

**Семінар 3 Археалагічныя старажытнасці Беларусі X–XIII ст.ст.**

1. Археалагічнае вывучэнне гарадоў Полацкай зямлі.
2. Археалагічнае вывучэнне гарадоў Турава-Пінскай зхямлі.
3. Археалагічнае вывучэнне гарадоў беларускага Панёмання.
4. Старажытны Мсціслаў XI–XIII стст.
5. Архітэктурная археалогія XI–XII стст.

Літаратура:

1. Штыхаў, Г.В. Археолагі дапаўняюць летапісцаў. / Г.В.Штыхаў. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 149 с.
2. Ткачоў, М.А. Старажытны Мсціслаў. / М.А.Ткачоў, А.А.Трусаў. – Мінск: Полымя, 1992. – 110 с.
3. Хозеров, И.М. Белорусское и смоленское зодчество XI-XIII вв. / И.М.Хозеров. – Минск: Навука і тэхніка, 1994. – 151 с.
4. Лысенко, П.Ф. Древний Пинск: XI-XIII вв./ П.Ф. Лысенко.- Пинск: Регион. типогр., 2017. – 172 с.
5. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009 – 2011. – 496 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Семінар 4 Археалагічныя старажытнасці Беларусі часоў ВКЛ (канец XIII- першай паловы XVI ст.ст.)**

1. Археалагічнае вывучэнне беларускіх замкаў.
2. Археалагічнае вывучэнне гістарычных цэнтраў, гарадоў.
3. Змены ў культурным плане беларускіх гарадоў і мястэчак.
4. З’яўленне і распаўсюджванне новых тыпаў зброі.

Літаратура:


1. Археалогія Беларусі. У 4 т. – Мінск: Беларуская навука, 1997-2001.
2. Ткачоў, М.А. Замкі і людзі. / М.А.Ткачоў. – Мінск: Навука і тэхніка,1991. – 184 с.
3. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества XI-XVII вв. / О.А.Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 160 с.
4. Трусаў, А.А. Стары замак у Гродне XI-XVIII стст. / А.А.Трусаў, В.Е.Собаль,Н.І.Здановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 152 с., іл.


**Семінар 5 Археалагічныя старажытнасці Беларусі часоў Рэчы Паспалітай (другая палова XVI- канец XVIII стст.)**

1. Археалагічнае вывучэнне бастыённых замкаў.
2. Культурны пласт беларускіх гарадоў і мястэчак
3. Археалагічнае вывучэнне культавага грамадскага дойлідства.
4. Археалагічнае вывучэнне беларускай вёскі і шляхецкіх сядзібаў.

Літаратура:


1. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009 – 2011. – 496 с.
2. Здановіч, Н.І., Трусаў, А.А. Беларуская паліваная кераміка XI- XVIII стст. / Н.І.Здановіч, А.А.Трусаў. – Минск: Навука і тэхніка, 1993 – 183 с.
3. Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XVI – XVIII стст.: планіроўка, культурны слой. / А.К.Краўцэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества XI-XVII вв. / О.А.Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 160 с.

**Семінар 6 Археалогія Беларусі Новага часу (XVI- канец XVIII стст.)**

1. Беларускае кафлярства.
2. Паліваны беларускі посуд.
3. Беларускае шклaробства.
4. Металаапрацоўка і ювелірная справа.

Літаратура:

1. Трусаў, А.А. Беларускае кафлярства. / А.А.Трусаў. – Мінск: Перамога, 1993. – 53 с.
2. Ганецкая, І.У. Маёліка на Беларусі ў XI – XVIII стст. / І.У.Ганецкая – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 88 с.
3. Здановіч, Н.І., Трусаў, А.А. Беларуская паліваная кераміка XI- XVIII стст. / Н.І.Здановіч, А.А.Трусаў. – Минск: Навука і тэхніка, 1993 – 183 с.
4. Археалогія Беларусі. У 4 т. – Мінск: Беларуская навука, 1997-2001.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

### 4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі матэрыяльнай культуры.

Форма выканання работы – напісанне рэфератаў, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме (па выбару).

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай.

### 4.2 Пытанні да самаправеркі

**Тэма 1. Асноўныя метады археалагічных даследаванняў**

1. Метад дендрахраналогіі.
2. Фізічныя метады ў археалогіі.
3. Падводная археалогія.
4. Аэрафотаздымкі ў археалогіі.

**Тэма 2. Развіццё археалоіі як навукі**

1. Адкрыццё Егіпецкай цывілізацыі.
2. Даследаванні цывілізацый Старажытнай Месапатаміі.
3. Дзейнасць Артура Эванса на в.Крыт.
4. Пошукі легендарнай Троі.
5. Раскопкі скіфскіх курганаў.

**Тэма 3. Старажытныя будаўнічыя матэрыялы**

1. Археалагічнае дрэва. Спосабы яго кансервацыі .
2. Гісторыя старажытнай цэглы. Плінфа і цэгла-пальчатка.
3. Выкарыстанне каменю  ў манументальным дойлідстве .
4. Дахоўкі і пліткі падлогі па дадзеных археалогіі.

**Тэма 4. Земляробства па дадзеных археалогіі**

1. Пераход ад матыжнага да ворнага земляробства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Сельскагаспадарчыя прылады працы па дадзеных археалогіі.
3. Асноўныя раслінныя культуры на тэрыторыі Беларусі.
4. Старажытныя зерняцёркі і жорны.
5. Конская вупраж па дадзеных археалогіі.

**Тэма 5. Жывёлагадоўля і паляванне па дадзеных археалогіі**

1. Асноўныя этапы жывёлагадоўлі на тэрыторыі Беларусі.
2. Прыручэнне сабакі, ката і свінні.
3. Паляўнічая зброя па дадзеных археалогіі.
4. Гарбарства ў Беларусі.

**Тэма 6. Матэрыяльная культура беларускіх замкаў**

1. Тэхніка будаўніцтва і асноўныя канструкцыі.
2. Археалагічнае вывучэнне замкаў-кастэляў.
3. Археалагічнае вывучэнне абарончых (інкастэліраваных храмаў).
4. Археалагічнае вывучэнне бастыённых замкаў.
5. Абарона беларускіх гарадоў па дадзеных археалогіі.

**Тэма 7. Матэріяльная культура беларускіх гарадоў XIV-XVIII ст.ст.**

1. Змены ў планіроўцы і забудове.
2. Узнікненне і развіццё беларускіх мястэчак.
3. Археалагічнае вывучэнне беларускіх ратуш.
4. Археаланічнае вывучэнне гарадскіх кляштараў і манастыроў.

### 4.3 Пытанні да экзамена

1. Гістарыяграфія археалогіі Беларусі.
2. Беларуская археалогія XIX – пачатку XX ст.
3. Археалагічная культура.
4. Развіццё археалогіі як навукі.
5. Беларускае шкларобства.
6. Беларускі керамічны посуд.
7. Беларускае кафлярства.
8. Археалагічныя старажытнасці Беларусі часоў Рэчы Паспалітай (др.пал. XVI– XVIII ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Беларуская археалогія першай паловы XX ст.
10. Беларуская археалогія другой паловы XX ст.
11. Неаліт Беларусі.
12. Палеаліт Беларусі.
13. Архітэктурная археалогія Беларусі XI–XIII ст.
14. Гродзенскае княства. Старажытны Навагрудак. Археалагічныя даследаванні і артэфакты.
15. Археалагічныя старажытнасці Беларусі часоў ВКЛ (канец XIII – першая палова XVI ст.).
16. Матэрыяльная культура беларускіх замкаў.
17. Знакамітыя археолагі XIX ст.
18. Дрыгавічы. Археалагічныя помнікі і артэфакты.
19. Мезаліт Беларусі. Археалагічныя помнікі і артэфакты.
20. Полацкая зямля. Археалагічныя даследаванні і артэфакты.
21. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. Археалагічныя помнікі і артэфакты.
22. Знакамітыя археолагі XX ст.
23. Археалагічныя калекцыі ў беларускіх музеях.
24. Тураўская зямля. Старажытны Пінск. Археалагічныя даследаванні і артэфакты.
25. Радзімічы і валыняне. Археалагічныя помнікі і артэфакты.
26. Варагі на Беларусі. Археалагічныя помнікі і артэфакты.
27. Вясковыя паселішчы і манастырскія комплексы.
28. Ліцейная справа. Ювелірныя вырабы ў Беларусі.
29. Археалагічнае даследаванне балтскіх плямён у Беларусі.
30. Земляробства на Беларусі ў X–XIII ст. па выніках археалагічных даследаванняў.
31. Зброя на Беларусі XIV–XVIII ст. па матэрыялах археалагічных даследаванняў.
32. Сельская гаспадарка ў XIV–XVIII ст. па матэрыялах археалагічных даследаванняў.
33. Жывёлагадоўля на Беларусі ў X–XVIII ст. па матэрыялах археалагічных даследаванняў.
34. Паляванне на Беларусі (X–XVIII ст.) па матэрыялах археалагічных даследаванняў.
35. Беларуская зброя ў X–XIII ст. па матэрыялах археалагічных даследаванняў.
36. Апрацоўка скуры і косці па матэрыялах археалагічных даследаванняў.
37. Старажытнае Бярэсце. Археалагічны музей.
38. Апрацоўка каменю ў неаліце і бронзавым веку.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

39. Неалітычныя шахты (капальні) пад Ваўкавыскам.

40. Крывічы. Археалагічныя помнікі і артэфакты.

41. Старажытнае кавальства па выніках археалагічных даследаванняў.

42. Гарады Полацкай зямлі. Археалагічныя помнікі і артэфакты.

43. Смаленская зямля. Старажытны Мсціслаў. Археалагічныя помнікі і артэфакты.

44. Археалагічная культура плямён жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Тэматычны план

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1. | Уводзіны | 2 | | | Выбарачнае апытанне |
| **Раздзел I. Станаўленне і развіццё археалагічнай навукі** | | | | | |
| 2. | Асноўныя метады археалагічных даследаванняў | 2 | | | Выбарачнае апытанне |
| 3. | Развіццё археалогіі як навукі | 2 | | | Выбарачнае апытанне |
| 4. | Беларуская археалогія XVIII-пачатку XX стст. | | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| 5. | Беларуская археалогія ў 1919-1941 гг. | 2 | 2 | | Выбарачнае апытанне |
| 6. | Беларуская археалогія другой паловы XX–пачатку XXI стст. | 2 | | 2 | Выбарачнае апытанне |
| **Раздзел II. Археалогія першабытнага грамадства** | | | | | |
| 7. | Каменны век на тэрыторыі Беларусі | 2 | | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 8. | Бронзавы і жалезны век на тэрыторыі Беларусі | 2 | | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| **Раздзел III. Археалогія ранняга сярэднявечча** | | | | | |
| 9. | Насельніцтва Беларусі ў VI-IX стст. | 4 | | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-презентацыя |
| 10. | Полацкая зямля па дадзеных археалогіі | 2 | | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-презентацыя |
| 11. | Смаленская зямля. Старажытны Мсціслаў | 2 | | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-презентацыя |
| 12. | Тураўская зямля. Старажытны Пінск | 2 | | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-презентацыя |
| 13. | Гродзенскае княства. Старажытны Навагрудак | 2 | | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-презентацыя |
| 14. | Архітэктурная археалогія | 4 | | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-презентацыя |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 15. | Археалагічныя старажытнасці гарадоў Беларусі X-XIII стст. | 2 | 2 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-презентацыя |
| **Р а з д з е л IV. Археалогія позняга сярэднявечча і Новага часу** | | | | | |
| 16. | Археалагічныя старажытнасці Беларусі часоў ВКЛ (канец XIII-першая палова XVI ст.) | 4 | 2 | | Выбарачнае апытанне |
| 17. | Археалагічныя старажытнасці Беларусі часоў Рэчы Паспалітай (другая палова XVI-канец XVIII ст.) | 2 | 2 | | Выбарачнае апытанне |
| 18. | Археалогія Беларусі Новага часу (XVI- XVIII ст.) | 2 | 2 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| | **Разам** | **40** | **12** | **14** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Асноўная літаратура


1. Авдусин, Д.А. Основы археологии: учебн.для вузов. / Д.А.Авдусин. – Москва: Вышэйшая школа 1989. – 333 с.
2. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Белоруссии XVI в. – 30-е годы XX в. / под ред. Б.А. Рыбакова. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
3. Вяргей, В.С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР. 1919-1941 гг./ В.С.Вяргей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.
4. Загорульский, Э.М. Археология Белоруссии. / Э.М.Загорульский. – Минск: Высшая школа, 1965. – 225 с.
5. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX стст./ Г.А.Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

6. Левко, О.Н. Практическая археология: учебн. пособие / О.Н. Левко. – Могилёв: МГУ им. А.А. Кулешова, 2006. – 256 с.
7. Лысенко, П.Ф. Древний Пинск: XI-XIII вв./ П.Ф. Лысенко.- Пинск: Регион. типогр., 2017. – 172 с.
8. Ткачоў, М.А. Замкі і людзі. / М.А.Ткачоў. – Мінск: Навука і тэхніка,1991. – 184 с.
9. Трусаў, А.А. Беларускае кафлярства. / А.А.Трусаў. – Мінск: Перамога, 1993. – 53 с.
10. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества XI-XVII вв. / О.А.Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 160 с.
11. Калядзінскі, Л.У. Уводзіны ў археалогію./ Л.У. Калядзінскі - Гродна: ТАА "ЮрСПрынт", 2012 – 240 с. – іл.
12. Фэйган,Б.М. Уводзіны ў археалогію /Б.М.Фэйган. – Мінск: Беларускі фонд Сораса, 1996. – 272 с.
13. Чарняўскі ,М.М. Неаліт Беларускага Панямоння. / М.М.Чарняўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 142 с.
14. Штыхаў, Г.В. Крывічы. / Г.В.Штыхаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 198 с.

### 5.3 Дадатковая літаратура

1. Археалогія Беларусі. У 4 т. – Мінск: Беларуская навука, 1997-2001.
2. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009 – 2011. – 496 с.
3. Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск: БелЭн, 1993. – 702 с.,іл.
4. Ганецкая, І.У. Маёліка на Беларусі ў XI – XVIII стст. / І.У.Ганецкая – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 88 с.
5. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X – XIII стст. (паводле археалагічных звестак)./Л.У. Дучыц. 3-е выд., – Мінск: Беларуская навука,2005. – 80 с.
6. Зайкоўскі, Э.М. Першабытныя помнікі Паўночнай Беларусі. / Э.М.Зайкоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 44 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Заяц, Ю.А. Заславль в эпоху феодализма. / Ю.А.Заяц. – Минск: Наука и техника, 1995. – 207 с.
8. Здановіч, Н.І., Трусаў, А.А. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. / Н.І.Здановіч, А.К. Краўцэвіч, А.А. Трусаў. – Минск: Навука і тэхніка, 1994 – 152 с.
9. Здановіч, Н.І., Трусаў, А.А. Беларуская паліваная кераміка XI- XVIII стст. / Н.І.Здановіч, А.А.Трусаў. – Минск: Навука і тэхніка, 1993 – 183 с.
10. История белорусской государственности. В 5т. Т1: Белорусская государственность от истоков: до конца XVIII в. / А.А. Коваленя [и др] Минск: Беларуская навука, 2018. 598 с.
11. Калечыц, А.Г. Першыя людзі на зямлі Беларусі: дапаможнік. / А.Г.Калечыц. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – 96 с.
12. Калечыц, А.Г. Чалавек і асяроддзе: каменны век, Заходняе Палессе. / А.Г. Калечыц – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 584 с.
13. Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага панямоння XVI – XVIII стст.: планіроўка, культурны слой. / А.К.Краўцэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.
14. Крывальцэвіч, М. Археалагічныя адкрыцьці сьвету. / М.Крывальцэвіч. – Мінск: Athenaeum, 2000. –124 с.
15. Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі Мінуўшчыны. / Э.А.Ляўкоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 215 с.
16. Пазняк, З. Рэха даўняга часу. / З.Пазняк. – Мінск: Народная асвета, 1985. – 111 с.
17. Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII-XVIII стст. / М.А.Ткачоў. – Мінск, 1978.
18. Ткачоў, М.А. Старажытны Мсціслаў. / М.А.Ткачоў, А.А.Трусаў. – Мінск: Полымя, 1992. – 110 с.
19. Трусаў, А.А. Стары замак у Гродне XI-XVIII стст. / А.А.Трусаў, В.Е.Собаль,Н.І.Здановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 152 с., іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20. Хозеров, И.М. Белорусское и смоленское зодчество XI-XIII вв. / И.М.Хозеров. – Минск: Навука і тэхніка, 1994. – 151 с.
21. Шчакаціхін, М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. / М.Шчакаціхін. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 336 с.
22. Штыхаў, Г.В. Археолагі дапаўняюць летапісцаў. / Г.В.Штыхаў. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 149 с.
23. Штыхов, Г.В. Города полоцкой земли (IX-XIII вв.). / Г.В.Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 159 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ